## Агляд падзей тыдня паводле афіцыйных крыніц ЕС

Падзеі мінулага тыдня ........................................................................................... 1

Сайт тыдня ........................................................................................................... 4

Фота тыдня ........................................................................................................... 4

Відэа тыдня........................................................................................................... 4

### Анонсы падзей 23-29 красавіка 2012 года

**23 красавіка** – у Люксембургу адбываецца сустрэча міністраў замежных спраў ЕС, падчас якой плануецца абмеркаваць сітуацыю ў М'янме пасля дадатковых выбараў 1 красавіка, падзеі ў Сірыі і Афганістане. Прэс-канферэнцыя па выніках сустрэчы (17:00)

**23 красавіка** – у Капенгагене прэзідэнт Еўракамісіі Барозу выступіць з лекцыяй "Будучыня ЕС – рух наперад, ад крызіса да развіцця". Пасля лекцыі адбудзецца дыскусія паміж Барозу, прэмьер-міністрам Даніі Хелле Торнінг-Шміт і прысутнымі. Лекцыя анлайн

**25 красавіка** – Еўракамісія прадставіць праект бюджэта на 2013 год, складзены ў адпаведнасці са стратэгіяй развіцця ЕС да 2020 года.

**25-26 красавіка** – у Кіеве адбудзецца канферэнцыя кансорцыюма "Ўсходні альянс", прысвечаная выкананню праграмы "Іст-Інвест" (East Invest). Прадстаўнікі 84 сябраў альянса абмяркуюць унёсак арганізацый па падтрымцы бізнеса ва ўзаемадзеянне дзяржавы і прыватнага сектара, а таксама ў справу прыцягнення інвестыцый у краіны Ўсходняга партнёрства. Больш падрабязна

### Падзеі мінулага тыдня

**ЕС дапаможа іншым краінам у развіцці ўстойлівай энергетыкі**

Новая ініцыятыва Еўрасаюза закліканая забяспечыць доступ да ўстойлівай энергетыкі 500 мільёнам жыхароў краін, што развіваюцца. Ініцыятыву прадставіў прэзідэнт Еўракамісіі Барозу 16 красавіка падчас саміта ЕС "Устойлівая энергетыка для ўсіх". Ініцыятыва разлічана да 2030 года, і на працягу двух наступных гадоў прадугледжвае прадастаўленне тэхнічнай дапамогі ў аб'ёме 50 млн. еўра.

**Краіны ЕС ператвараюць смецце ў рэсурсы**

Для некаторых краін-сябраў ЕС перапрацоўка смецця стала крыніцай прыбытку. Паводле справаздачы Еўракамісіі, гэтыя краіны перааапрацоўваюць да 70% адкідаў. Яны дасягнулі гэтага выніка праз эканамічнае ўздзеянне (напрыклад, падаткаабкладанне) ці забарону на спальванне альбо захаванне адходаў. Для вырашэння задач дарожнай мапы па эфектыўным выкарыстанні рэсурсаў, падобныя інструменты варта ўвесці ва ўсіх краінах ЕС, лічыць Еўракамісія.

## ЕС удасканальвае працу еўрапейскай чыгункі

Еўрапейская Камісія і дацкае старшынства ў ЕС 16 сакавіка ў Капенгагене адкрылі двухдзённую канферэнцыю па Еўрапейскай сістэме кіравання чыгункай (ERTMS). Гэтая сістэма вызначае адзіныя стандарты сігнальнага абсталявання чыгункі ва ўсёй Еўропе, правярае хуткасць цягнікоў і зніжае яе, калі патрэбна. Гэтыя меры неўзабаве дазволяць еўрапейскім цягнікам рухацца праз нацыянальныя чыгуначныя сеткі без затрымак ці дадатковых праверак.

## Новая ініцыятыва ЕС для стварэння працоўных месцаў

17 красавіка Еўрапейская Камісія распачала кампанію, якія заклiканая заахвоціць прадпрыемствы прымаць на працу больш практыкантаў, каб маладыя людзі здолелі набыць прафесійны досвед і павялічылі шанцы знайсці працу. У 2012-2013 гг. Камісія прафінансуе 280 тысяч стажыровак праз праграмы “Леанарда да Вінчы” ды “Эразмус”.

## Эштан шкадуе пра рашэнне Швейцарыі ўвесці квоты для жыхароў ЕС

Высокі прадстаўнік ЕС па замежных справах і палітыцы бяспекі Кэтрын Эштан шкадуе, што Федэральны савет Швейцарыі зноў увёў колькасныя абмежаванні для відаў на жыхарства, якія могуць быць выдадзеныя грамадзянам васьмі краін-сябраў ЕС. Эштан лічыць, што гэты захад не адпавядае Дамове аб свабодным перамяшчэнні асобаў, што не дазваляе ніякіх адрозненняў паміж грамадзянамі ЕС.

## Еўрапарламент асуджае рашэнне Аргентыны нацыяналізаваць кампанію YPF

Еўракамісія павінна выкарыстаць адпаведныя сродкі для вырашэння канфліктаў, даступныя праз Сусветную гандлёвую арганізацыю і Вялікую дваццатку, каб адказаць на “аднабаковае і адвольнае” рашэнне Аргентыны нацыяналізаваць энергетычную кампанію YPF. Аб гэтым кажа рэзалюцыя Еўрапарламента, прынятая 20 красавіка. Дэпутаты заклікаюць Камісію і Савет ЕС прыняць усе магчымыя меры, каб пазбегнуць падобнай сітуацыі ў будучыні.

## Еўрапраламент дазволіў перадачу ЗША дадзеных еўрапейскіх пасажыраў

Новае пагадненне па перадачы асабістых дадзеных пасажыраў ЕС амерыканскім уладам было ўхвалена Еўрапейскім парламентам 19 красавіка. Дамова дае юрыдычную падставу для абмена дадзенымі паміж ЕС і ЗША, а таксама прадпісвае ўмовы гэтага абмена: тэрмін захоўвання інфармацыі, правілы карыстання і захады па ахове дадзеных.

## Еўракамісія прапануе Грэцыі шляхі забеспячэння эканамічнага росту

Еўракамісія акрэсліла крокі, якія варта зрабіць Грэцыі на працягу 2012 года ў межах узгодненай праграмы па пераадоленні крызіса. Камісія таксама прапанавала спіс мер, што могуць дапамагчы краіне забяспечыць эканамічны рост, стварыць новыя працоўныя месцы і дасягнуць сацыяльнай з’яднанасці.

### Інфляцыя еўразоны стабілізавалася на ўзроўні 2.7%

Гадавы паказчык узроўню інфляцыі ў краінах зоны еўра ў сакавіку застаўся на ўзроўні лютага і склаў 2.7%, перадае Еўрастат. У ЕС гадавая інфляцыя ў сакавіку склала 2.9% і таксама не змянілася ў параўнанні з лютым.

### Сальда знешняга гандлю таварамі ў еўразоне дасягнула +2.8 млрд. еўра

Згодна першых ацэнак, знешні гандлёвы баланс краін еўразоны быў на ўзроўні +2.8 млрд. еўра ў лютым 2012 года ў параўнанні з -2.8 млрд. роўна год таму.  Па стане на пачатак бягучага года гандлёвы баланс зоны еўра склаў -7.9 млрд, а ў студзені 2011 года ён быў на ўзроўні -16.1 млрд. Экспарт і імпарт у лютым 2012 года ў параўнанні са студзенем 2012 года выраслі на 2.4% і 3.5% адпаведна.

### Еўрапейскі банк рэканструкцыі і развіцця дапамагае малому бізнесу ў Азербайджане

Еўрапейскі банк рэканструкцыі і развіцця выдаў азербайджанскаму AccessBank крэдыт у памеры 15 млн. долараў, прызначаны для крэдытавання малога бізнесу. Такі захад ЕБРР зрабіў больш даступнымі фінансавыя сродкі для вельмі малых, малых і сярэдніх прадпрыемстваў у рэгіёнах па-за межамі Баку. Асаблівая ўвага падчас выдачы крэдытаў будзе нададзеная праектам па развіццю сельскай гаспадаркі.

### Праект Усходняга партнёрства адраджае помнікі культуры Арменіі і Грузіі

Праблема аховы помнікаў архітэктуры на Паўднёвым Каўказе цяпер вырашаецца з дапамогай двухгадовага праекта “SOS Культура”, які фінансуецца ў рамках Усходняга партнёрства. Праект імкнецца не толькі захаваць помнікі культуры ў аддаленых памежных рэгіёнах Арменіі і Грузіі, але і падтрымаць устойлівае эканамічнае, сацыяльнае і гуманітарнае развіццё гэтых месцаў, зрабіць іх прывабнымі для турыстаў.

**Сайт тыдня**

Саміт ЕС “Устойлівая энергетыка для ўсіх”

**Фота тыдня**

Экалагічны праект па ахове армянскага возера Севан пры падтрымцы ЕС

**Відэа тыдня**

Еўракамісія прапануе пакет мер для стварэння новых працоўных месцаў у ЕС

*Агляд падрыхтаваны Цэнтрам еўрапейскіх даследванняў для Прадстаўніцтва ЕС у Беларусі*